# АЙЧЫНА. ДЗЯРЖАВА. ВЕРА




## Алесь КАЗЕКА



*Спаўзліся цмокі і грызуць*
*граніцы*
*Зямелькі шматпакутнае ізноў –*
*У праблісках агністай*
*навальніцы*
*Ім перамога лёгкая трызніцца.*
*Але з крыжом Збавіцеля ў*
*правіцы*
*Паўстала Беларусь, каб*
*заступіцца*
*За Веру, за Надзею, за Любоў,*
*Даверыўшыся Богу.*
*– Ойча Авва,*
*Як будучыню роднае зямлі*
*Ад цмокаў зберагчы –*
*ад бед-навалаў?*
*І зразумеў адказ...*
*Шануйце славу*
*Бацькоўскай веры і шануйце*
*справы,*
*Якімі продкі вашыя дзяржаву*
*І спадчыну адвеку берaглі.*

## Алеся ЦЭВАН



## Не згараючы

*Золатам палае далеч небасхілу.*
*Як мне не хапае моцных белых*
*крылаў,*
*Каб ляцець павольна над маёй*
*старонкай,*
*Дзе шчабечуць птушкі весела*
*і звонка,*
*Дзе лясы гамоняць і спяваюць*
*рэкі.*
*Харaство такое для душы,*
*як лекі*
*Ад трывог і болю, цяжкіх*
*успамінаў.*
*І адразу радасць – Бог нас*
*не пакінуў,*
*Бо Яго ўсмешка – водблескамі*
*сонца,*
*Каб нам жыць па праўдзе*
*і любіць бясконца,*
*І глядзець наперад, не тужыць*
*аб долі,*
*І не падаць духам, не згараць*
*ніколі.*

## Роднае

*Родныя словы ды ціхія песні*
*Шэптам бярозак гучаць*
*напрадвесні.*
*Льюцца ласкавыя гукі крынічкі,*
*І пад страхой размаўляюць*
*сінічкі.*
*Гэта ўсё светлае, чыстае,*
*наша.*
*Варыць бабулечка ячную кашу,*
*Перад гасцямі стол накрывае.*
*«Ойча наш» шэпча ды песню*
*спявае.*
*Сходзіць у пуню, падоіць карову:*
*«Вам малачка! Людзі, будзьце*
*здаровы!*
*У шчасці жывіце, жывіце*
*ў згодзе.*
*Краваправліццяў, нянавісці*
*годзе!»*
*... У сініх вачах яе – яснае неба.*
*Гледзячы ў іх, разумеем, як трэба*
*Верыць, любіць і да Бога*
*імкнуцца,*
*І да людзей сваіх родных*
*гарнуцца.*
*Каб тут жыць, за яе паміраць.*
*Беларусь, дзе ж яшчэ ёсць*
*такая, як ты? –*
*Не збіраюся нават шукаць.*

## Жыровіцкія званы

*Да цудадзейных, светлых*
*абразоў*
*Нядзельным, ціхім,*
*прахалодным раннем,*
*Дзе верасень спяшаўся*
*да ютрані*
*Пад дабравест жыровіцкіх*
*званоў,*

*Пайшоў і я, амаль што след*
*у след,*
*Каб са святой алтарнае*
*крыніцы*
*Бясконцай чысцінёю наталіцца*
*І разгадаць сакральны*
*запавет.*

*Ліліся гукі малітоўных слоў,*
*Звінеў у спеўным хоры*
*«Сімвал веры»,*
*І сэрца расчынілася ў даверы*
*Сугуччу меладычных галасоў.*

*Гулі званы, вялі свой дыялог*
*Пра тое, што было і вечна*
*будзе...*
*І сталі бліжэй да вытокаў*
*людзі,*
*Душой уразумеўшы:*
*Слова – Бог.*

## Уладзімір ЯСЕЎ



## Айчыне

***Дзе ж яшчэ ёсць другая***
***такая, як ты,***
***Дарагая мая Беларусь?..***
**Алесь Бачыла**

*Я знайду многа шчырых*
*пачуццяў і слоў,*
*Па палетках тваіх ідучы,*
*Каб усім паказаць: трапяткая*
*любоў*
*Дзіўным імем у сэрцы гучыць.*

*Ажываюць легенды даўніны*
*сівой,*
*Вольнасць духу і продкаў зямля.*
*Ты сілкуеш з калыскі пяшчотай*
*сваёй,*
*Ты – надзея і праўда мая!*

*А ці ёсць за цябе даражэй*
*і мілей*
*У вянку з васільком і суніц?*
*Над прасторам тваім сонца*
*зззяе святлей*
*Ад пявучых натхняльных*
*крыніц.*

*Скрыжаванні шляхоў паварну*
*да цябе –*
*Узыйду на бацькоўскі парог.*
*Толькі тут у спагадзе мой*
*дух адпачне*
*Ад сумнёваў і смутных трывог,*

*На зямлі, што ў спадчыну далі*
*дзяды,*

## Валянціна ГАБРУСЕВА



*Дзякую, дзякую, дзякую*
*Табе, Усявышні Гасподзь,*
*Што сонца высокай адзнакаю*
*Благаслаўляеш: «Узыходзь!»*
*Што вывеў сцяжынку дзяцінства*
*У наканаваны мне шлях,*
*З радасцю мацярынства,*
*Пад пошчак салоўкі ў лугах.*
*Дзякую, дзякую, дзякую*
*За непаўрадкоўе маё*
*Ля хаты бацькоўскай з брамкаю,*
*Расчыненай у жыццё.*
*За веру маю неўміручую*
*У вечнасць матулі-зямлі,*
*За вербы твае плакучыя*
*Над тымі, што тут палеглі.*
*Дзякую, што ты лашчыш*
*Мары мае не ў сне,*
*І зачахляеш пашчу*
*Бязлітаснае вайне.*
*Што не даеш чорным сілам*
*Зноў спапяліць зямлю, –*
*Аб гэтым адным прасіла.*
*Толькі аб гэтым малю!*
*... Дзякую... Дзякую... Дзякую*

## Алёна БЕЛАНОЖКА



## Адзіны народ

*Калі на світанку*
*Ты сонца ўпускаеш*
*У светлы свой дом,*
*Са шчырай вітанкай*
*Гасцей сустракаеш*
*Багатым сталом,*

*Сумленна працуеш,*
*Ва ўсім знаеш меру,*
*Вядзеш за сабой,*
*Калі ты шануеш*
*Герояў і веру*
*Айчыны сваёй,*

*Калі баляванне*
*Няўрымслівых думак*
*Ты здолееш спыніць,*
*Не здрадзіў каханню,*
*Бярэш накірунак*
*На тое, каб жыць,*

*Заўжды клапаціўся,*
*Каб вечнага роду*
*Агмень не пагас –*
*То ты нарадзіўся*
*З асобнай нагоды*
*У правільны час!*

*Твой лёс, наша моладзь –*
*Да зор дакрануцца,*
*Да ветру часоў!*
*Няхай дапамогуць*
*Плячо аднадумца*
*І вернасць сяброў!*

*Нас наша краіна*
*Пад сцягам збірае –*
*Мы робім свой крок!*
*Ёсць гэта хвіліна.*
*Яна пачынае*
*Адлік перамог!*

*Мы – сіла Радзімы,*
*Надзейная варта*
*Ад бур і нягод!*
*Наш выбар адзіны –*
*Адзіная праўда,*
*Адзіны народ!*

## Марыя ІСАЕНКА,

**пераможца Міжнароднага літаратурнага конкурсу «Это нужно – не мертвым! Это надо – живым!»**



## Любовью к Родине дыша

*Век человека мал и скоротечен,*
*Бессмертна только светлая*
*душа.*
*Мы начинаем путь земной*
*извечно,*
*Любовью чистой к Родине*
*дыша.*
*От первого младенческого*
*плача*
*За детскою заветною мечтой*
*Стремимся мы, надеясь*
*на удачу,*
*Туда, куда зовет нас мир*
*большой.*

*Года бегут, но не забыть*
*начала –*
*Тот самый уголок родной*
*земли,*
*Где в детстве колыбельку*
*мать качала*
*И трепетало сердце от любви,*

*Где все безмерно близко*
*и знакомо:*
*Тропинка узкая вдоль берега*
*реки,*
*Уютный сад за бабушкиным*
*домом,*
*Ночная песня тихая ракит...*

*Как в детстве, дома пахнет*
*теплым хлебом,*
*Душистым медом, молоком*
*парным...*
*И счастье – ранним утром*
*видеть небо –*
*Таким бескрайним, чистым,*
*голубым.*

*Ковром душистых трав домой*
*путь выстлан.*
*Царят повсюду мир*
*и благодать...*
*И больно даже от случайной*
*мысли*
*О том, что может этого*
*не стать.*

*Не дай-то Бог война – нам,*
*не робея,*
*Сражаться – будет нужно –*
*грудью лечь!*
*Не допустить проклятых*
*лиходеев*
*И для потомков край наш*
*уберечь.*

*Чтобы в огне не сгинул*
*он бесследно,*
*Нам каждому пройти*
*придется шаг*
*И встретить с честью час,*
*пусть и последний,*
*Любовью вечной к Родине*
*дыша.*

**Літаратурную старонку падрыхтавалі Алесь КАЗЕКА і Святлана КАЗЕКА.**